


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. ПЯТНІЦА № 189 (28047) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Не баяцца, а абследавацца

СТАР. 4



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр РУМАК, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

*«Сёння ў краіне пражываюць 2,5 млн пенсіянераў, з іх 82% — атрымальнікі пенсіі па ўзросце. Больш за 640 тысяч пенсіянераў працуюць, у астатніх крыніцай даходу з'яўляецца пенсія. Таму асноўная сацыяльная задача дзяржавы — падтрыманне ўзроўню пенсій, забеспячэнне своечасовасці і паўнаты выплат. Гэтая задача выконваецца. Дарэчы, сярэдні памер пенсіі ў верасні гэтага года склаў Br2,8 млн».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.10.2015 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 17673,00 ▲ |
| Еўра | 19697,00 ▼ |
| Рас. руб. | 271,61 ▲ |
| Укр. грыўня | 837,19 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Прытуліцца да радзімы...



Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

**Вёска Камень, што ў Валожынскім раёне, сваю назву атрымала нездарма: побач з паселішчам ляжыць вялізны валун, які адносіцца да перыяду бронзавага веку. Для месцічаў гэты сівы волат — сімвал радзімы, да яго прыходзяць і ў горы, і ў радасці, яго ўспамінаюць, апынуўшыся далёка ад бацькоўскай хаты. Прыходзяць сюды і юнакі, якім хутка ў войска: каб набрацца жыццядайнай энергіі і, адслужыўшы, абавязкова вярнуцца да роднага парога.**

■ Сваё не горшае

## ШАМПУНЬ ПАД ЗАКАЗ І ТРЭНАЖОР НАПРАКАТ

### Якіх бытавых паслуг не хапае ў вёсцы

**Каля будынка комплекснага прыёмнага пункта Вілейскага камбіната бытавога абслугоўвання насельніцтва, што ў вёсцы Даўгінава, жанчыны жыва абмяркоўваюць мясцовыя навіны.**
**— Ці магу я пагутарыць з загадчыцай? — звяртаюся да іх.**
**— З прыёмшчыцай, — папраўляе мяне адна, відаць, самая бойкая маладзіца. — Пачакайце крыху, яна хутка будзе: заказ бабульцы панесла на дом, тая патэлефанавала, што не можа сама забраць, бо прыхварэла.**

Сапраўды, праз хвілін дзесяць з'явілася Ганна Лазовік.

Жанчыны ўвайшлі ў памяшканне следам за ёй. І адразу пасыпаліся пытанні. Нехта цікавіўся, калі прывязуць новую партыю шампуняў, іншыя дапытваліся, калі будзе мыйны парашок канкрэтнай маркі, а хтосьці пачаў перабіраць рэчы, раскладзеныя на паліцах.

— Няўжо сродкі гігіены нельга купіць у крамах, якіх нямала ў Даўгінаве? — здзівілася я.

— Можна, але тут танней, — пачула ў адказ. — А яшчэ ў комплексным прыёмным пункце багаты выбар пасцельнай бялізны, посцілак, пледаў, коўдраў, ручнікоў, што прывозяць з раённага камбіната бытавога абслугоўвання. Усё гэта, так бы мовіць, ручной работы, не тое, што на рынку.

— Сапраўды, мы прапаноўваем людзям толькі якасны тавар, — пацвярджае Ганна Іванаўна. — Напрыклад, пасцельная бялізна шыецца з бязі Баранавіцкага камбіната. Наматрацнікі — з тоўстай і шчыльнай тканіны. Гэтыя рэчы служаць доўга і не губляюць таварнага выгляду.

У асноўным у комплексным прыёмным пункце рэалізуюцца тавары, што карыстаюцца попытам у вяскоўцаў, у ліку іх вёдры, тазы, прадметы сельскагаспадарчага прызначэння, бытавая хімія. Калі ў наяўнасці няма рэчы, якая камусьці спатрэбілася, то яе прывозяць з райцэнтра пад заказ. Рэалізуюцца і вырабы швейнай фабрыкі «Світанак».

СТАР. 3

■ Надвор'е

## БЕЗ ДАЖДЖОЎ І ЦЁПЛЕНЬКА

### Сіноптыкі абяцаюць нават да плюс 22 градусаў

**Сёння ўдзень умовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі будзе вызначаць цёплая паветраная маса, якая паступае з Балтыйскага мора. Чакаецца воблачна з праясненнямі. Пераважна без ападкаў, толькі па поўначы месцамі невялікія кароткачасовыя дажджы, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**

Прагназуецца ўмераны заходні вецер, часам парывісты. Максімальная тэмпература паветра складзе 12-18 цяпла. На выхадныя на тэрыторыі нашай краіны будзе гаспадарыць зона павышанага атмасфернага ціску. Удзень 4 кастрычніка да нас завітаюць больш цёплыя паветраныя масы, якія паступаюць з боку Цэнтральнай Еўропы. Менавіта ў гэты дзень сіноптыкі абяцаюць першую хвалю «бабінага лета». Таму захаваецца ўмерана цёплае, пераважна без ападкаў надвор'е. Уначы і раніцай на выхадныя ў асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ўначы на суботу будзе складаць ад 3 да 10 цяпла, а ўдзень — плюс 13-19 градусаў. У нядзелю ўдзень стане яшчэ цяплей. Тэмпература паветра ўначы на нядзелю 3-8 цяпла, удзень сонейка прыгрэе да плюс 14-20 градусаў, а па поўдні краіны будзе ўвогуле да 22 цяпла.

### А Ў ЧЭХІЮ ЎЧОРА ПРЫЙШЛА ЗІМА

**У першы дзень кастрычніка на тэрыторыі Чэхіі была зафіксавана тэмпература ў мінус 10 градусаў. Гідраметэаралагічная служба гэтай краіны адзначае, што такая халодная анамалія здарылася ўпершыню за амаль трохсотгадовую гісторыю метыяназіранняў у гэтым рэгіёне. Рэкордная тэмпература паветра была зарэгістраваная ў раёне ракі Йізеркі ў Паўночнай Чэхіі.**

Папярэдні рэкорд мінусовых тэмператур на гэту дату там быў літаральна тры гады таму. Тады слупок тэрмометра апусціўся амаль да мінус 4 градусаў. Спецыялісты адзначаюць, што рэзкае пахаладанне адбылося ўвогуле на ўсёй тэрыторыі Чэхіі. У сталіцы гэтай краіны, дзе яшчэ тыдзень таму паветра прагравалася да плюс 25 градусаў, пахаладала да чатырох градусаў. Эксперты-метэаролагі гэтай краіны не выключаюць, што надыходзячая зіма будзе адной з найбольш суровых за апошнія гады. Згодна з іх даўгатэрміновым прагнозам, сёлета ўзімку тут чакаюць моцных снегападаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# МАКСІМАЛЬНА ДЭМАКРАТЫЧНА, МІРНА, НА ВЫСОКІМ АРГАНІЗАЦЫЙНЫМ УЗРОЎНІ

## павінны прайсці выбары ў нашай краіне

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе аб бягучай сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў краіне, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Прэзідэнт падкрэсліў, што выбары — важнейшая форма народнага волевыяўлення. «Гэта і ёсць сапраўдная дэмакратыя. Краевугольны стрыжань гэтай дэмакратыі — волевыяўленне народа. Выбары павінны прайсці максімальна дэмакратычна, мірна, на высокім арганізацыйным узроўні, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Народ павінен адкрыта і сумленна прыйсці на выбары і прагаласаваць».

Аляксандр Лукашэнка заклікаў беларусаў прыйсці на выбарчыя ўчасткі і прагаласаваць так, як яны лічаць патрэбным, паколькі кожны голас важны для будучага краіны. «Мы абавязаны разумець, што, выбіраючы кіраўніка дзяржавы, мы вызначаем і далейшы шлях развіцця краіны. У яго аснове клопат аб нашых людзях, сем'ях, аб дастатку, спакойным жыцці, бяспецы», — аднзачыў Прэзідэнт.

Гэта выбарчая кампанія праходзіць у няпростых эканамічных умовах. «Усім даводзіцца эканоміць, скарачаць, зніжаць сабекошт», — сказаў кіраўнік дзяржавы, дадаўшы, што на гэтую праблему ў час саміту ААН звярталі ўвагу лідары вялікіх дзяржаў.

Тым не менш прымаемыя ўрадам меры не павінны негатыўна ўплываць на людзей, запатрабаваў Прэзідэнт. «Зарплаты, пенсіі, іншыя сацыяльныя абавязацельствы дзяржавы з'яўляюцца прыярытэтам, як і цэны, экспарт, дэбіторская запазычанасць. Мы дасягнулі дна, і ніжэй падаць проста не маем права — ужо няма куды. Таму рух павінен быць абавязкова толькі ўверх», — сказаў ён. У час нарады кіраўніку дзяржавы было даложана аб прынятых кроках па пералічаных напрамках.

Акрамя таго, на нарадзе абмяркоўвалася палітычная абстаноўка ў краіне, настрої ў грамадстве, паводзіны грамадскіх фарміраванняў, атмасфера ў працоўных калектывах.

Яшчэ адзін блок пытанняў датычыўся забеспячэння грамадскай бяспекі і правапарадку як у перыяд правядзення выбарчай кампаніі, так і пасля яе завяршэння. «Нельга дапусціць ніякіх правакацый, несанкцыянаваных акцый, процізаконных дзеянняў з боку розных дэструктыўных сіл», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Народ ужо на прыкладзе суседзяў наеўся і правакацый, і рэвалюцый», — дадаў ён. Паводле слоў беларускага лідара, удзел у саміце ААН даў магчымасць яму яшчэ раз пераканацца ў тым, што «ідзе жорсткая барацьба не толькі за перадзел рэсурсаў, доступ да рэсурсаў, ідзе барацьба за перадзел свету». «Ідзе барацьба. Усе прыкрываюцца, прыгожыя словы гаворыць, прапановы, заявы робяць, але падтэкстам гучыць уласны інтарэс кожнай дзяржавы. Асабліва ўладных людзей. Таму трэба быць заўсёды ўважлівымі, бачыць сваю краіну, свой народ, берагчы сваю краіну і народ. Мы павінны служыць гэтаму народу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі з савецкіх часоў прывыклі, што выбары — гэта свята для людзей. Для таго, каб сёлетняя выбарчая кампанія прайшла гэтак жа, ёсць усё, гэта не запатрабуе ніякіх затрат — ні па лініі культуры, ні па лініі гандлю, упэўнены кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што арганізатары выбараў не імкнуцца такім чынам некага задобрыць: «Гэтага рабіць ні ў якім разе нельга. Беларусы не дурні, яны цудоўна разумеюць. Калі мы пачынаем іх залішне задобрываць, у іх з'яўляюцца пытанні — навошта і чаму. Таму не трэба рабіць ніякіх глупстваў. Трэба ісці на выбары так, як ёсць, але ўлічваючы, што гэта экзамен, — проста дашліфаваць усё, падцягнуць і на ўзроўні правесці, каб людзі ішлі на выбары як на свята».

«А ўжо іншаземцы няхай ацэньваюць, як хочуць — гэта іх справа і іх права. У іх гэта па-іншаму, нейкае шоу. Нам шоу арганізоўваць не трэба», — дадаў кіраўнік дзяржавы. Выбары ў краіне будуць праводзіцца па беларускім заканадаўстве, па Канстытуцыі, і ніхто не мае права адступаць ад гэтых законаў, падкрэсліў ён. Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў Беларусі гатовы выслухаць меркаванне Захаду наконт выбарчага права і адкарэкціраваць яго, калі прапановы будуць разумныя і прымальныя, не будуць супярэчыць нацыянальнаму заканадаўству. У гэтым плане беларускі бок ужо нямала зрабіў.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка чарговы раз паўтарыў сваё патрабаванне — «выбары павінны прайсці адкрыта, у строгай адпаведнасці з беларускім заканадаўствам і захаваннем грамадскага парадку».

«Неабходна выканаць усе ўзятыя намі абавязацельствы, у тым ліку забяспечыць нармальную бесперашкодную дзейнасць і сваіх, і замежных наглядальнікаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт заклікаў усіх, хто непасрэдна нясе адказнасць за арганізацыю і правядзенне выбарчай кампаніі, максімальна мабілізавацца, каб яна прайшла бездакорна.

■ Парламенцкі дзённік

# ДЗЯРЖАВА І ПРЫВАТНЫ БІЗНЕС ЗБЛІЖАЮЦЦА

## Сёння ў Палаце прадстаўнікоў разглядаецца праект закона «Аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве»

**Гэты дакумент — найважнейшая частка праграмы ўрада па падтрымцы прыватнага сектара ў нашай дзяржаве. На днях для таго, каб унесці канчатковыя прапановы ў законапраект перад прадстаўленнем яго ў Авальнай зале, на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы сустрэліся парламентарыі, прадстаўнікі міністэрстваў, міжнародных арганізацый, прыватнага бізнесу.**

— Мы прыйшлі да пасяджэння дастаткова, на маю думку, падрыхтаванымі ва ўсіх адносінах, — адзначыў на пачатку сустрэчы **Віктар ВАЛЮШЫЦКІ, старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы.** — Тэма дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў краіне на слыху ўжо многія гады. Яшчэ былі ўмацоўваў нашы тэарэтычныя асновы праект праграмы развіцця ААН, які функцыянуе ў Беларусі другі год. У сувязі з гэтым нам будзе цікавая ацэнка міжнародных экспертаў нашага законапраекта і той працы, якая здзейснена, перш за ўсё, Міністэрствам эканомікі як распрацоўшчыкам гэтага законапраекта і, безумоўна, нашай Камісіяй, у якой сёння ён знаходзіцца.

Па словах **першага намесніка міністра эканомікі Аляксандра ЗАБАРОЎСКАГА**, гэты законапраект — значны элемент усяго эканамічнага радку дня ў нашай дзяржаве.

— Мы запрашалі самых лепшых міжнародных экспертаў для таго, каб гэты закон атрымаўся эфектыўным і ўнёс свой уклад у развіццё дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў нас, — адзначыў намеснік міністра. — Разам з тым мы імкнуліся не перагружаць сам праект закона дэталямі. Усё ў заканадаўстве прадугледзець немагчыма і не патрэбна, сам законапраект факусіруецца на галоўных прынцыповых пытаннях, пакідаючы магчымасць для ўдасканалення праваприменяльнай практыкі падчас рэалізацыі адпаведных праектаў. Разам з тым трэба сказаць пра базавыя прынцыпы, якія мы заклалі — прынцыпы адкрытасці, канкурэнтнасці, актыўнага ўдзелу і выканання дзяржавай тых абавязацельстваў, якія яна будзе са свайго боку браць у рамках праектаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

**Джэфры ГАМІЛЬТАН, кіраўнік секцыі па супрацоўніцтве і партнёрстве аддзела эканамічнага супрацоўніцтва Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН,** паведаміў, што ўзаемадзеянне Праграмы развіцця ААН і Беларусі па пытаннях дзяржаўна-прыватнага партнёрства пачалося прыкладна тры гады таму.

— Па сканчэнні гэтага часу мы ўжо можам бачыць рэальныя вынікі. Вельмі важна, каб у самым пачатку быў вельмі моцны закон, які б дазволіў інвестарам атрымаць параду. Сёння перад намі ляжыць вельмі добры праект, які ўжо амаль гатовы.

Эксперты ад Арганізацыі Аб'яднаных Нацый даволі высока ацанілі нашы пілотныя праекты дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

— Я лічу, што калі вы будзеце працягваць працаваць у тым жа кірунку і ў тым жа тэмпе, то можаце стаць лідарам ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне па развіцці дзяржаўна-прыватнага партнёрства, — выказаў упэўненасць Джэфры Гамільтан.

У лік сямі пілотных праектаў увайшла рэканструкцыя аўтамабільнай дарогі М10: мяжа Расійскай Федэрацыі (Селішча) — Гомель — Кобрын. Таксама на аснове дзяржаўна-прыватнага партнёрства плануецца будаўніцтва Бешанковіцкай ГЭС на рацэ Заходняя Дзвіна Віцебскай вобласці і рэканструкцыя комплексу будынкаў гарадской клінічнай бальніцы №3 у Гродне пад Гродзенскі абласны клінічны анкалагічны дыспансер. Акрамя таго, плануецца пабудаваць завод для спальвання смецця цеплавой магутнасцю да 1,2 МВт і электрычнай магутнасцю да 1,0 МВт у Бабруйску; магістральную вуліцу ў Гомелі працягласцю 41,35 км з улікам будаўніцтва моста праз раку Сож і пяці пуцеправодаў; дзіцячыя дашкольныя ўстановы адукацыі ў рэгіёнах Мінскай вобласці; першую чаргу гісторыка-культурнага комплексу «Брэст» у межах вонкавых абаронных валоў Брэсцкай крэпасці.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■

■ Прафтэхадукацыя

# КАЛІ ЎСЁ ВЫРАШАЮЦЬ КАДРЫ

**«Беларусь — адзіная на постсавецкай прасторы краіна, якая не проста захавала сістэму прафтэхадукацыі, але і працягвае яе паспяхова развіваць, — заявіла намеснік прэм'ер-міністра нашай краіны Наталля КАЧАНАВА, якая ўзяла ўдзел ва ўрачыстым сходзе, прысвечаным 75-годдзю сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. — Асноўная яе функцыя — гэта падрыхтоўка кадраў для ўсіх галін эканомікі нашай краіны».**



Фота БЕЛТА.

**Намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА ўручае Ганаровую грамату Савета Міністраў Полацкаму дзяржаўнаму хіміка-тэхналагічнаму каледжу.**

«Наша задача — не проста выпускаць спецыялістаў для галін эканомікі з другім-трэцім разрадам, а рыхтаваць спецыялістаў з больш высокай кваліфікацыяй», — падкрэсліла яна.

Таксама Наталля Качанава закранула тэму функцыянавання рэсурсных цэнтраў, якіх у рэспубліцы налічваецца 34: у такіх цэнтрах для падрыхтоўкі спецыялістаў у адным месцы канцэнтруецца самае сучаснае навучанне. «Я лічу, што ў іх будучыня», — дадала яна.

Работнікаў сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі павіншаваў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар БУЗОЎСКІ**. Ён зачытаў прывітальны адрас кіраўніка дзяржавы, у якім адзначаецца, што «сістэма прафтэхадукацыі адыгрывае значную ролю ў прафесійным станаўленні моладзі, уносіць свой уклад у фарміраванне ў яе актыўнай грамадзянскай пазіцыі, культуры працы і адказных адносін да справы». Ігар Бузоўскі таксама ўручыў узнагароды лепшым выкладчыкам, майстрам вытворчага навучання, ветэранам сістэмы. Каля 50 педагогаў сістэмы прафтэхадукацыі атрымалі ўзнагароды Савета Міністраў, Савета Рэспублікі, Палаты прадстаўнікоў, міністэрстваў і ведамстваў.

— Сучасная сістэма прафадукацыі прадстаўлена шматузроўневымі і шматпрофільнымі ўстановамі. Зараз мы ідзём шляхам стварэння кластараў, якія будуць аб'ядноўваць як установы адукацыі, так і прадпрыемствы, для якіх рыхтуюцца кадры, — расказаў пра перспектывы развіцця галіны **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.** — Уваходжанне Беларусі ў ЕАЭС і міжнародную эканамічную і адукацыйную прастору патрабуе з боку сістэмы прафесійнай адукацыі адэкватнай рэакцыі. У новых умовах сістэма прафтэхадукацыі заклікана ў першую чаргу забяспечыць кваліфікацыйнымі кадрамі прарыўныя высокатэхналагічныя напрамкі развіцця нацыянальнай эканомікі, якія базуюцца на тэхналогіях V і VI тэхналагічных укладаў.

У Беларусі з'явілася рэальная магчымасць звярнуцца да недаступнага нам яшчэ зусім нядаўна замежнага досведу, параўнаць нашу прафесійную адукацыю з найлепшымі сусветнымі практыкамі.

— З далучэннем да руху WorldSkills мы ўсклададаем вялікія надзеі на пераадоленне стэрэатыпаў у дачыненні да прафесій, якія датычацца рэальнай вытворчасці. Упэўнены, што, маючы залаты фонд інжынерна-педагагічных работнікаў, кіраўнікоў, абапіраючыся на досвед ветэранаў, мы паспяхова справімся з рашэннем задач, якія ставіць перад намі краіна і час, — рэзюмаваў Міхаіл Жураўкоў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

# ВЫСОКІЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў БЫЛЫХ КАЗАРМАХ

**У Гродне распачалася рэканструкцыя былых будынкаў пагранічнага атрада, дзе атрымае прапіску першы ў краіне рэгіянальны філіял Парка высокіх тэхналогій.**

Праектныя работы прафінансаваў гарадскі бюджэт, а ўсе астатнія расходы бярэ на сябе Парк высокіх тэхналогій. З аднаго боку, ён выступае інвестарам па наданні «другога жыцця» будынкам у гістарычным цэнтры горада над Нёманам, якія доўгі час пуставалі. А з другога — клапоціцца аб пашырэнні свайго бізнесу, прычым цяпер ужо не толькі ў сталіцы. Тым больш што адпаведных спецыялістаў рыхтуе ГрДУ імя Янкі Купалы.

Рэканструкцыю гэтага аб'екта плануецца завяршыць да красавіка-мая наступнага года. У былых казармах размесціцца рабочыя месцы супрацоўнікаў ПВТ, будуць створаны камфортныя ўмовы для навучання сучасным IT-тэхналогіям, для семінараў, трэнінгаў і дзелавых сустрэч. Акрамя таго, ужо добраўпарадкоўваюць тутэйшую зялёную зону. У прыватнасці, з'явяцца альтанкі для адпачынку і сонечны гадзіннік, прывядуць у парадак рэчышча і берагі рачулкі Юрысдыка. Усё гэта робіцца не толькі для спецыялістаў Парка высокіх тэхналогій, але і для ўсіх жыхароў і гасцей горада, бо ўваход на тэрыторыю будзе вольным.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

*prakopchik@zviazda.by*

■ Жыві і помні

# Мост узаемапаразумення і прымірэння

## Мемарыяльны комплекс у Трасцянцы павінен стаць не толькі музеем, а і духоўным цэнтрам



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

**У Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры імя Ё. Рау падвялі вынікі сумеснай адукацыйнай працы, звязанай з мемарыялам у Трасцянцы, абмеркавалі перспектывы рэалізацыі другой чаргі праекта на месцах масавага знішчэння людзей ва ўрочышчах Благаўшчына і Шашкоўка.**

Нагадаем, 22 чэрвеня гэтага года з удзелам Прэзідэнта Беларусі на тэрыторыі былога лагера была адкрыта першая чарга мемарыяльнага комплексу «Трасцянец». Але напярэдзе яшчэ шмат працы. І гэта тычыцца не толькі будаўніцтва, тэматычнага напаўнення комплексу, а і гістарычнага аспекту. Трасцянецкая трагедыя паранейшаму мае шмат «белых плям»: пачынаючы ад колькасці загінулых (па розных звестках, у Трасцянцы было знішчана ад 50 да 206 тысяч 500 чалавек), заканчваючы пайменным ушанаваннем ахвяр.

— Таксама трэба шукаць розныя шляхі для ўзаемапаразумення, — лічыць **кіраўнік Дортмундскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра Петэр ЮНГЕ-ВЕНТРУП.** — Выступаючы ў Мінску ў маі гэтага года, міністр у адстаўцы Германіі Гернот Эрлер ад свайго імя і ад імя федэральнага ўрада папрасіў прабачэння за тыя злачынствы, якія ў гады вайны на тэрыторыі Беларусі здзейснілі немцы. На мой погляд, гэта важны крок, які сведчыць аб тым, што мы можам спадзявацца на дасягненне ўзаемапаразумення.

Як адзначыў **мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ,** мы ўспамінаем трагедыю Трасцянца не для таго, каб наноў раздзіраць не да канца загоеныя раны і пасыпаць іх соллю, а каб падобнае ніколі не паўтаралася, каб вучыцца на ўроках гісторыі, захаваць гэтую гісторыю ў камні. «На погляд каталікоў, праваслаўных, іўдзеяў і прадстаўнікоў іншых веравызнанняў, гэты комплекс павінен быць не толькі музеем, а і духоўным цэнтрам, — падкрэсліў кіраўнік Каталіцкай Царквы Беларусі. — Мы выношваем ідэю, каб на тэрыторыі Трасцянца былі ўладкаваны месцы малітвы: магчыма, невялікія капліцы. Я не бачу праблемы нават у тым, што яны размесцяцца пад адным дахам. Калі будуць штодзённыя богаслужэнні, туды проста прыйдуць людзі. І ідучы да малітвы, яны будуць памятаць пра тыя злачынствы, якія адбываліся на гэтым месцы».

Для **настаяцеля храма ў гонар Усіх Святых протаіерэя Фёдара ПОЎНАГА** трагедыя ў Трасцянцы з'яўляецца вельмі асабістай. Дзве яго родныя цёткі і дзядзькі былі спалены ў лагеры за тры дні да вызвалення Мінска. «Тое, што адбываецца сёння ў Трасцянцы, гэта не толькі сведчанне нашай гістарычнай памяці, але і, самае галоўнае, атрыманне тых урокаў, якія не далі б магчымасці паўтарыцца страшным трагічным старонкам нашай гісторыі, — лічыць святар. — Унікальнасць праекта ў тым, што ён дае нам права па-сапраўднаму ўспрыняць сябе, беларусаў, як народ і нацыю. І тое, што падчас сустрэчы ў ААН Прэзідэнт Аўстрыі падышоў да Прэзідэнта Беларусі і асабіста падзякаваў яму за мерапрыемствы ў Трасцянцы, гаворыць пра многае. Пра тое, што мы знаходзім унікальныя месцы судакранання і дыялогу, бо дыялог на базе гістарычнай памяці ўнікальны і заўсёды мае станоўчыя вынікі».

І аб гэтым сведчыць тое, што праца па ўшанаванні трасцянецкіх ахвяр працягваецца. Праектаваннем месца памяці ў Шашкоўцы займаецца Мінскпраект, ва ўрочышчы Благаўшчына — творчая майстэрня імя Левіна. Практычная рэалізацыя праектаў будзе адбывацца паэтапна. Усё залежыць ад фінансавання. Вядома, што немцкі бок ужо пераvеў на рахунак 400 тысяч еўра. Але гэтага недастаткова.

— Пакаленне нашых бацькоў вybудавала мост узаемапаразумення і прымірэння з тымі, хто ў пэўны перыяд жыцця быў па іншы бок акопа, — перакананa **кіраўнік творчай майстэрні Левіна і намеснік старшыні Саюза беларускіх яўрэйскіх арганізацый і абшчын Галіна ЛЕВІНА.** — Калі гэта знікне хоць у адным пакаленні, мы можам страціць апоры «моста», якія дазваляюць нам здабываць урокі з таго, што адбылося. І пакуль не будуць прачытаны ў Трасцянцы малітвы ўсіх канфесій, пакуль мы годна не памянём на гэтым месцы, не зможам казаць, што мы, сучасныя пакаленні, выканалі сваю справу.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Сезон

# КІРМАШЫ ЗАПРАШАЮЦЬ ПАКУПНІКОЎ

**Да лістапада па ўсіх абласцях і Мінску запланавана правядзенне 1 042 кірмашоў па продажы сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў яе перапрацоўкі, аб гэтым паведамілі ў Міністэрстве гандлю.**

У сталіцы, напрыклад, пройдзе 180 такіх кірмашоў, у Віцебскай вобласці — 120, у Магілёўскай — 189. Найбольшая колькасць іх адбудзецца на Гомельшчыне — 240. У Мінску па 15 лістапада рашэннем Мінгарвыканкама ва ўсіх адміністрацыйных раёнах горада для рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі з аўтамашын і латкоў вызначаны 175 пляцовак. Па прынцыпе заявы, згодна з памянёным рашэннем, выдадзена 588 дазволаў сялянскім (фермерскім) гаспадаркам, сельгасвытворцам і фізічным асобам на штодзённы гандаль.

Як адзначаюць у міністэрстве, найбольшай актыўнасцю адрозніваецца гандаль на пляцоўках па пятніцах і ў выхадныя дні. Разам з тым, калі на якую-небудзь пляцоўку ў адзін з дзён не прыехаў які вытворца, становішча ратуюць больш за 180 кірмашоў, што пройдуць у асенні перыяд, а таксама каля 600 крам, якія рэалізуюць садавіннаагародніннную прадукцыю, і латочны гандаль.

Лічбы

Агульны тавараабарот кірмашоў ужо дасягнуў 3,6 мільярда рублёў. Рэалізавана 369 тон прадукцыі, у тым ліку бульбы і садавіннаагародніннай прадукцыі — 332 тоны (з іх бульбы 146 тон, гародніны — 161 тона, яблыкаў — 25 тон), мяса, каўбасных вырабаў — 12 тон, рыбы і рыбапрадукцыі — 7 тон, іншай прадукцыі — 18 тон.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Падрабязнасці

# КРАН УПАЎ НА ДОМ

## Былі пашкоджаны паветраная лінія электраперадач і газаправод

**Мы ўжо паведамлялі пра падзенне вежавага крана на вуліцы Грушаўскай у сталіцы. Гэта здарылася ранкам у панядзелак на будоўлі 16-павярховага шматкватэрнага жылога дома. Пры гэтым кран зачапіў як шматпавярховік, так і прыватны драўляны дом побач. Нагадаем, пры падзенні пацярпеў 25-гадовы кранаўшчык: мужчыну шпіталізавалі са шматлікімі траўмамі.**

Пазней высветлілася, што ў момант, калі на драўляны аднапавярховы прыватны дом абрынуўся кран, у ім знаходзіліся людзі — 23-гадовая маці і яе двухгадовая дачка, а таксама 61-гадовая пенсіянерка ў суседняй кватэры. На шчасце, яны не пацярпелі. У самім жыллі былі пашкоджаны сцяна, дах, перакрыцці на плошчы 20 квадратных метраў адной з кватэр. На пятым паверсе новабудоўлі кран пашкодзіў дзве пліты перакрыцця, маналітную калону і адну панэльную сцяну, а таксама лабавое шкло прыпаркаванага ўнізе аўтамабіля «Міні Купер». Апроч таго, з-за абрушэння былі пашкоджаны паветраная лінія электраперадач і газаправод нізкага ціску. Без электрычнасці засталіся 20 прыватных дамоў па уліцы Грушаўскай і 5-м Чыгуначным завулку, без газу — тры прыватныя дамы па Грушаўскай. Перакрываўся аўтамабільны рух. Увесь панядзелак вяліся аднаўленчыя работы. К вечару рух аўтатранспарту, падача электрычнасці і газу спажыўцам па вуліцы Грушаўскай былі адноўлены. Прычына здарэння яшчэ ўстанаўліваецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Як нас дураць

# ПРАДАВАЛА... ЧУЖУЮ МАЁМАСЦЬ

## На падмане даверлівых грамадзян махлярка зарабіла больш за мільярд рублёў

**Жыхарка Гродна, якую раней ужо судзілі за махлярства, наймала кватэры і выстаўляла іх на продаж. Пры гэтым прадстаўлялася рыэлтарам ці спецыялістам агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры, а цэны былі ніжэйшыя за рыначныя. Увайшоўшы ў давер патэнцыяльных пакупнікоў, яна атрымлівала ад іх буйныя грашовыя сумы і абяцала самастойна аформіць усе неабходныя дакументы. Акрамя таго, грошы пазычаліся альбо браліся быццам на развіццё сумеснага бізнесу. Зноў жа без намеру іх у далейшым вярнуць.**

**Афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці Сяргей ШАРШАНЕВІЧ** паведаміў, што па заявах пацярпелых следчыя завялі 12 крымінальных спраў па фактах крадзяжоў шляхам падману і злоўжывання даверам, у тым ліку ў асабліва буйным памеры, і аб'ядналі іх у адной вытворчасці. Агульная сума прычыненых страт складае каля 1,5 мільярда рублёў. Махлярку заключылі пад варту. Следства працягвае высвятляць абставіны злачынстваў, а таксама ўстанаўлівае іншых грамадзян, якія маглі пацярпець ад яе злачынных дзеянняў. Для гэтага варта звяртацца па тэлефоне (8-0152) 72-42-01 альбо ў дзяжурную часць УСК па Гродзенскай вобласці — тэл. (8-0152) 72-40-40.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

# ШАМПУНЬ ПАД ЗАКАЗ І ТРЭНАЖОР НАПРАКАТ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У спецыяльнай вітрыне вывешаны ўзоры адзення, у тым ліку і рабочага, вырабаў з трыкатажу. Любы наведвальнік можа выбраць фасон, што яму спадабаўся, Ганна Лазовік здыме неабходныя меркі, а ў раённым камбінаце сшыюць для яго абноўку. Штодзень з райцэнтра прыходзіць машына, якая прывозіць тавар, выкананыя заказы і забірае новыя. Двойчы на месяц прыязджае швачка: камусьці трэба падкараціць спадніцу, а некаму — падкласці ці абрэзаць штаны.

— На недахоп наведвальнікаў не скардзімся, — сцвярджае мая субяседніца. — Ёсць у нас і пастаянныя кліенты, якія ацанілі якасць і даступнасць тавараў і паслуг. Іх кошт у нас значна ніжэй, чым у горадзе. Гэта і зразумела, заробкі ў сельскай мясцовасці, як правіла, адстаюць ад гарадскіх.

— І якімі паслугамі найбольш карыстаюцца людзі? — пытаюся ў Ганны Іванаўны.

— Цяжка сказаць. Запатрабаваныя пашыў адзення, трыкатажу, пасцельнай бялізны, чыстка пер'евых падушак, шмат наведвальнікаў і падчас прыезду цырульніка.

У комплексным прыёмным пункце абсталяваны ўсім неабходным асобны пакой для цырульніка, які наведваецца ў Даўгінава раз на тыдзень. Цэны тут намнога ніжэй, чым у Мінску. Гэтым карыстаюцца нават сталічныя пенсіянеры, якія ў летні час практычна жывуць на дачах. Разам з тым для многіх катэгорый грамадзян дзейнічаюць зніжкі. У прыватнасці, для дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў, дзяцей-сірот, выхаванцаў са шматдзетных сем'яў, воінаў-інтэрнацыяналістаў, інвалідаў І і ІІ груп, адзінокіх старых, у якіх пенсія ніжэйшая за бюджэт пражыткoвага мінімуму. Адзін раз на месяц бясплатна абслугоўваюцца інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны.

Асобны куток адведзены для рытуальных паслуг. Тут сваякі могуць набыць усё неабходнае для таго, каб годна правесці блізкага ў апошні шлях: вянкі, кветкі, крыжы, труны. Дарэчы, у Даўгінаве адкрыўся і прыватны магазін рытуальных рэчаў — канкурэнт комплекснаму прыёмнаму пункту. У аграгарадку, на мой погляд, шмат прыватных магазінаў, дзе цэны цалкам прымальныя. Як сцвярджае мясцовая жыхарка Раіса Паўлаўна Ніжнік, на некаторыя прадукты, гародніну, садавіну кошт нават ніжэйшы, чым у Вілейцы ці на мясцовым рынку. Кожную нядзелю сюды з'язджаюцца гандляры і прадпрымальнікі з Мядзела, Вілейкі, Докшыц, прапануюць прадукты, прамысловыя тавары, свойскіх жывёл, птушак. Але на рынак бытавых паслуг прыватнік не спяшаецца. У першую чаргу бярэцца за аказанне тых паслуг, што прыносяць хуткі прыбытак.

Комплексны прыёмны пункт абслугоўвае не толькі аграгарадок Даўгінава, але і ўсе вёскі сельсавета. Сярод іх і аддаленыя, у якіх засталіся практычна адны пажылыя людзі. У многіх няма сіл і здароўя, каб дабрацца да цэнтра: адрамантаваць абутак ці набыць неабходную ў гаспадарцы рэч.

**«У кагосьці і часу нестае, каб зазірнуць у мясцовы «Дом быту». А зойдзе прыёмшчыца ў дом да чалавека — і ён абавязкова ўспомніць, што яму нешта трэба. Як той казаў, калі гара не ідзе да Магамета, то ён сам прыходзіць да гары...»**

— Наведваюся ў суседнія вёскі калі пехатой, а калі і на машыне, прымаю заказы, затым гатовыя вязу назад, — кажа Ганна Лазовік. — Кручуся, як магу, пад ляжачы камень вада не бяжыць.

У кагосьці і часу нестае, каб зазірнуць у мясцовы «Дом быту». А зойдзе прыёмшчыца ў дом да чалавека — і ён абавязкова ўспомніць, што яму нешта трэба. Як той казаў, калі гара не ідзе да Магамета, то ён сам прыходзіць да гары...

— А навошта вам трэнажор? Няўжо нехта карыстаецца ім? — пацікавілася ў сваёй суразмоўцы.

— Такое абсталяванне купіць — не кожнаму па кішэні, — тлумачыць яна. — А ў нас можна ўзяць напракат. І карыстаецца такой магчымасцю не толькі моладзь, але і людзі сярэдняга ўзросту. Як правіла, на месяц атрымліваецца танней. Напрыклад, гадзіна заняткаў каштуе 6 300 рублёў, суткі — 21 800 рублёў, месяц — 84 700 рублёў. Ахвотна бяруць напракат і бытавую тэхніку. Напрыклад, адзін кліент трымаў халадзільнік амаль два гады, пакуль не набыў свой.

На бачным месцы знаходзіцца кніга прапаноў. Прагартала — адны падзякі.

— У людзей няма прэтэнзій да работы комплекснага прыёмнага пункта, — сказалі ў Даўгінаўскім сельскім Савеце. — Прынамсі, да нас іх не паступала. Вось, праўда, некалькі чалавек звярталіся з просьбай, каб цырульнік прыязджаў часцей...

На аўтобусным прыпынку двое мужчын чакаюць маршрутку на Маладзечна. Разгаварыліся.

— Якіх паслуг не хапае ў Даўгінаве, — запыталася ў іх. — Можа, фітнесу, мыйкі аўтамашын? Ці чаго іншага?

У адказ яны засмяяліся:

— Усё неабходнае ў нас ёсць. А машыну можна памыць і ў сваім двары — вады хапае. А штo тычыцца фітнесу... Мая жонка даярка, а я механізатар, за дзень так напрацуемся, што нам не да фізкультуры...

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■ Інфарм-укол

# НЕ ТРЭБА БАЯЦЦА!

## Зрабіце ў кастрычніку мамаграфію

**Штогод у краіне выяўляецца каля 4 тысяч новых выпадкаў раку малочнай залозы, і даволі значная доля — на позніх стадыях, хоць на сённяшні дзень няма ніякіх цяжкасцяў выявіць яго амаль у зачаткавым стане, калі захворванне добра лечыцца.**



Кастрычнік стане месяцам барацьбы супраць раку малочнай залозы. Акцыя такога кшталту праводзіцца ў свеце з 1990-х, і ў шэрагу краін да яе далучаюцца нават камерцыйныя цэнтры, якія робяць зніжкі на дыягнастычнае абследаванне. У нас на такую барацьбу ў кастрычніку вылучалася пара дзён, аднак сёлета кампанія будзе досыць шырокай. Акрамя інфармацыйнага складніка, мяркуецца даць жанчынам магчымасць трапіць да ўрача-мамолага ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава па суботах — 10-га, 17-га і 24-га кастрычніка (з 9.00 да 15.00). Пры неабходнасці пасля такой кансультацыі будзе выконвацца ўльтрагукавое абследаванне малочнай залозы або мамаграфія (магчыма, і абодва даследаванні). На сайце цэнтра будзе ажыццяўляцца папярэдні электронны запіс.

— Якім бы дасканалым ні было лячэнне раку малочнай залозы, калі яно пачынаецца на 3-4 стадыях захворвання, гаварыць пра вылечванне не даводзіцца, — тлумачыць **загадчыца лабараторыі рэканструктыўнай хірургіі і онкамамалогіі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, галоўны пазаштатны мамолаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Яўгенія ШАПАВАЛ.** — Пры 1-й жа стадыі пяцігадовая выжывальнасць дасягае 95 працэнтаў, пры нулявой — амаль 100 працэнтаў. Таму ранняя дыягностыка сёння ўяўляецца больш важнай. Хоць у любым выпадку, калі б ні было выяўлена гэтае захворванне, трэба змагацца і згаджацца на лячэнне. Практыка паказвае, што нават у вельмі цяжкіх выпадках удаецца дасягнуць рэмісіі, падоўжыць жыццё. Мы змагаемся за кожны месяц і год.

На жаль, у поле зроку спецыялістаў трапляе нямала жанчын з вялікімі пухлінамі і метастазамі. Такія пацыенткі адзначаюць, што даўно заўважылі пэўныя змены ў залозе, аднак... баяліся абследавацца. Думалі, што ў іх што-небудзь знойдуць.

Калі сама жанчына выяўляе падчас так званага самаабследавання нейкія змены, то тут трэба мець на ўвазе два моманты. Папершае, як правіла, гэта не рак, бо злаякасныя пухліны распаўсюджаны куды менш за дабраякасныя, якія, як вядома, добра лечацца і не пагражаюць жыццю. Па-другое, калі тое, што выявіла жанчына, і сапраўды рак, то як мінімум 2-й стадыі, бо на самых ранніх стадыях яго і не ўбачыш, і не адчуеш.

Вось чаму яшчэ з 1963 года развіты свет практыкуе масавае абследаванне здаровых жанчын пэўнага ўзросту. Дзякуючы гэтаму Злучаным Штатам удаецца сёння на фоне захварэльнасці, якая ў два разы вышэйшая, чым у нас, мець такую ж, як у нас, смяротнасць ад раку малочнай залозы. Абследаванне заключаецца ў правядзенні ўльтрагукавога даследавання залозы здаровым жанчынам ва ўзросце да 50-55 гадоў і мамаграфіі па дасягненні гэтага ўзросту. Такога кшталту скрынінг у кожнай краіне мае свае асаблівасці. Наша краіна высвятляе гэтыя асаблівасці ў межах пілотнага праекта, які яшчэ з канца 2012 года працягваецца ў большасці абласцей і ў Мінску па раннім выяўленні раку малочнай залозы сярод абсалютна здаровых жанчын.

У Савецкім раёне сталіцы скрынінгавае мамаграфічнае абследаванне прайшлі ўжо звыш 6 тысяч 50-69-гадовых жанчын. У 40 з іх быў выяўлены рак. У палове выпадкаў гэта была 1-я стадыя, у пары выпадкаў — нулявая, а ў астатніх, галоўным чынам, 3-я. Варта адзначыць, што эфектыўнасць мамаграфіі вызначаецца выяўленнем раку малочнай залозы менавіта на нулявой і першай стадыях, паколькі для больш позніх стадый існуюць іншыя спосабы абследавання, самым сучасным і інфарматыўным з якіх з'яўляецца, напрыклад, магнітна-рэзанансны тамограф.

— Узрост 50-69 гадоў рэкамендаваны для абследавання Міжнародным агенцтвам па вывучэнні раку, — тлумачыць Яўгенія Шапавал. — Гэта рэкамендацыя агульная, аднак кожная краіна мае свае асаблівасці. **Агульнай рэкамендацыяй агенцтва з'яўляецца і абследаванне згаданай катэгорыі жанчын адзін раз на два гады.** Зноў жа, пасля правядзення скрынінгавых даследаванняў розныя краіны вызначалі сваю перыядычнасць. У Францыі гэта, напрыклад, адзін раз на 1,5 года, у Эстоніі — раз на тры гады.

**У Савецкім раёне сталіцы скрынінгавае мамаграфічнае абследаванне прайшлі ўжо звыш 6 тысяч 50-69-гадовых жанчын. У 40 з іх быў выяўлены рак.**

Аднак ці можна спаць спакойна гэтыя 1,5-3 гады? Ці не можа рак узнікнуць і развіцца за такі кароткі час? Аказваецца, можа. Але бывае гэта надзвычай рэдка. Гэта катэгорыя прамежкавых, так званых агрэсіўных ракаў. У такіх надзвычайных выпадках узрост можа не адыграваць ніякай ролі. У 34-гадовай пацыенткі пухліна 1-й стадыі можа быць з нізкім злаякасным патэнцыялам, а ў 80-гадовай — агрэсіўная. Сталы ўзрост, як вядома, сам па сабе фактар рызыкі развіцця пухлін: чым старэйшы ўзрост, тым вышэйшая верагоднасць развіцця раку. Анкалогія ў маладых — гэта, хутчэй, генетычныя паломкі. Варта нагадаць, што рак малочнай залозы бывае і ў мужчын — такія выпадкі складаюць 1 працэнт ад усіх выпадкаў гэтага віду раку. Звычайна за год такі дыягназ ставіцца 30-40 мужчынам. Моцны пол павінен ведаць, што яны таксама маюць малочную, а не грудную, залозу.

Наогул да групы рызыкі ў нас адносяцца жанчыны ва ўзросце 60-64 гады, з лішняй вагой, нізкай фізічнай актыўнасцю; тыя, што кураць, любяць выпіць; бяздзетныя; тыя, у каго менструацыі рана пачаліся і позна закончыліся; якія ўжывалі гарманальныя кантрацэптывы, прэпараты эстрагенаў; з хваробамі печані і шчытападобнай залозы; чые сваякі пакутавалі ад падобнай паталогіі; якія не ўмеюць спраўляцца са стрэсам.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

# ДОКАЗ ЛЮБОВІ



## Як пераканаць пажылых бацькоў берагчы сябе

Кажуць, пасля спорных вераснёўскіх дажджоў грыбы пайшлі-такі. Засушлівым летам на іх і спадзявання не было, затое цяпер і баравікі, і апенькі, і нават грузды адначасова павыскоквалі. Так і карціць апынуцца ў пранізаным сонцам бярэзніку, пільна ўглядацца ў стракаты дыван з пераблытанай, пацямнелай ужо травы і апалай лістоты, радасна бегчы да заўважанай здалёк здабычы, якая насамрэч можа аказацца проста водбліскам святла ці чырвонай «далонькай» клёна...

Такія вось цёпла-прыемныя асацыяцыі з водарам дзяцінства (пах стомленай зямлі, спаленага бульбоўніку і халоднага паветра ранніх прыцемкаў) з'яўляюцца штогод менавіта паміж вераснем і кастрычнікам. Але з таго часу, як стала ўважліва праглядаць інфармацыйныя ленты, гэтыя асацыяцыі набылі прысмак горычы. Бо ўжо нават не прадчуваеш — ведаеш: пачаўся грыбны сезон — будуць блудзіць, прападаць, паміраць нашы старыя. Кожны год спадзяешся, што страшная статыстыка, нарэшце, застыне: столькі ўжо сказана і напісана пра гэты адваротны бок цікага палявання, што нават дурны і абыякавы павінен задумацца. Але чарговы верасень шчодра сыпле дождж і сонечныя промні — і лічыльнік няшчасных выпадкаў у лесе ўключаецца зноў.

Спачатку ў Шумілінскім раёне шукалі 77-гадовую бабулю, якая блукала па лесе амаль трое сутак. Яе, зняселеную, але, дзякуй Богу, жывую, міліцыянеры знайшлі ў балоце зусім недалёка ад дому. Літаральна праз тыдзень, ужо ў Расонскім раёне, сцэнарый быў не такі аптымістычны. 71-гадовую пенсіянерку шукалі чатыры дні, а знайшоўшы, нічым дапамагчы ўжо не змаглі. Яшчэ пяць дзён — і новая сумная навіна: у лесе Гарадоцкага раёна знойдзена мёртвай 75-гадовая жанчына, якую шукалі ўсе выхадныя. Шукаць было цяжка: вакол балота, да таго ж бабуля недачувала. У той жа дзень ля Суража шукалі 78-гадовага грыбніка (на шчасце, пад вечар ён сам знайшоў дарогу), а ў Лёзненскім раёне цэлы дзень гукалі і сігналілі яго 76-гадоваму таварышу па няшчасці, які ўжо зацемна здолеў выйсці на гукі клаксона.

Такі вось невясёлы верасень. А ўвогуле, як адзначаюць у Міністэрстве ўнутраных спраў, з пачатку года паступіла без малога дзвесце заяў аб знікненні грыбнікоў і ягаднікаў, прычым у асноўным людзей пажылога ўзросту.

Сёння, бадай, я ўпершыню не стану на бок гэтых самых пажылых людзей і не буду ім спачуваць і спрабаваць зразумець. Вядома, можна шмат і правільна гаварыць пра тое, што нашы састарэлыя бацькі шукаюць сабе прыгод з прычыны недастатковай увагі з нашага боку, праз тое, што адчуваюць сябе нікому не патрэбнымі. І гэта, на жаль, вельмі часта сапраўды так. Але ёсць яшчэ адна прычына, якая цягне іх на слабых нагах і з павышаным ціскам у лес збіраць грыбы (як варыянты — у адзіночку капаць бульбу на вялізным участку, касіць двор, цягаць дровы, у кожнай сям'і знойдзецца што расказаць пра сваіх няўрымслівых родных людзей). І прычына гэта — любоў да нас, дзяцей, унукаў, праўнукаў, клопат пра нас. Бо хто ж набярэ і насоліць грыбочкаў вечна занятай гарадскімі справамі дачушцы, як не мама ці бацька. Бо да выхадных абавязкова трэба прыбраць усё вакол хаты, каб дзеткі прыехалі і адпачылі — ім і на працы хапае. Бо як жа гэта ўнучачка з яе далікатнымі пальчыкамі і доўгімі пазногцікамі палезе драць з зямлі тую бульбу?..

Мы абураемся, бяссільна разводзім рукамі, саміх сябе пасля супакойваем: маўляў, робіць, значыць, ёсць здароўе, на ланцуг жа чалавека не пасадзіш. А можа, варта было б не сварыцца да роспачных слёз, а спакойна і разважліва гаварыць вось гэтыя словы (якія, спадзяюся, прачытае і мая мама, і іншыя нашы чытачы далёка пенсійнага ўзросту).

Дарагія нашы, любімыя, найлепшыя ў свеце бацькі! Калі вы сапраўды любіце сваіх дзяцей і ўнукаў, калі клапоціцеся пра іх, беражыце сябе, калі ласка. Увіце хоць на міг тую роспач, якую вашы родныя, якіх усё жыццё песцілі, адчуюць, калі вы не вернецеся з лесу, паваліцеся з інсультам у разоры або зваліцеся з лесвіцы, на якую лезці вам было зусім не абавязкова. Колькі гора яны перажывуць, калі вас вось так, па-дурному, не стане, з якім пачуццём віны за тое, што не заступілі сцежку, не аказаліся побач, яны будуць жыць. Як цяжка ім будзе, калі вы праз тое, што рупіліся зрабіць як мага больш, страціце здольнасць рухацца, калі хвароба або траўма прыкуе вас да ложка. Падумайце, што ім давядзецца кінуць або памяняць любімую работу, як яны будуць мучыцца, гледзячы на вашы пакуты... Падумайце, уявіце, пакладзіце ўвесь гэты цяжар на адну шалю вагаў. А на другую — жменьку грыбоў, колькі кашоў бульбы ці буракоў ды скошаны без вялікай патрэбы падворак.

Я вельмі спадзяюся, што хтосьці скажа гэтыя словы, а яшчэ больш — на тое, што нехта іх пачуе. І што верасень стане проста прыгожым грыбным месяцам, а не сезонам, калі ў лесе і балотах блукаюць, прападаюць і паміраюць чыесьці самыя блізкія людзі.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

■ Ну і ну!

# ЗДАВАЛАСЯ Б, ЗВЫЧАЙНАЯ КОСТАЧКА...

## Але яна стварыла сур'ёзную пагрозу хлопчыку

**Неардынарны спосаб прымянілі хірургі Гродзенскай абласной дзіцячай бальніцы, каб выдаліць іншароднае цела з арганізма аднагадовага Арцёма.**

Гэтым прадметам аказалася костачка ад слівы, якую хлопчык паклаў у рот, калі застаўся пакінутым без нагляду ў садзе. Костачка засела ў страваводзе і амаль цалкам закрыла яго прасвет. А паколькі бацькі звярнуліся па медыцынскую дапамогу толькі праз трое сутак, то на гэтым месцы ўтварыўся моцны ацёк. Калі малога даставілі з Астраўца ў абласную дзіцячую бальніцу, то ён ужо не мог глытаць, арганізм абязводжваўся.

Дастаць костачку са стрававода дзіцяці аказалася вельмі складана. Не дапамаглі ні фібрагастраскоп, ні эзафагаскоп. Няўжо не застаецца нічога, акрамя складанай хірургічнай аперацыі? Вось тут і паказала свой прафесіяналізм брыгада ўрачоў-рэаніматолагаў на чале з Дзмітрыем Міскевічам. Было вырашана задзейнічаць бронхаскапічную тэхніку, дзякуючы якой костачку зрушылі з месца і выдалілі. Праз шэсць дзён Арцёма, у якога ўжо няма праблемы з глытаннем, выпісалі з бальніцы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона**

**по продаже права заключения договора аренды сроком на 3 года КОМПЛЕКСА ЗДАНИЙ С БЛАГОУСТРОЙСТВОМ,**

**расположенного по адресу: г. Минск, ул. Харьковская, 14, 14/1.**

Земельный участок площадью 0,3749 га с кадастровым номером 500000000006002522.

**Начальная цена продажи права с НДС – 13 816 200 бел. руб. Задаток – 1 381 620 бел. руб. Сумма арендной платы в месяц с НДС – 155 277 771 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже права заключения договора аренды комплекса зданий с благоустройством, принадлежащего ОАО «ГЗК»,* **проводимом 14 октября 2015 г.**

Аукцион состоится **14.10.2015 в 11.30** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 12.10.2015 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6.

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Минский курьер» от 24.02.2015 № 21.*

Условия участия, срок подписания договора аренды, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by** в разделе «Продажа недвижимости».

**Телефоны для справок:**
**8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52.**

# «Беларусь 4» — у трэндзе!

**— Мы разлічваем на тое, што рэгіянальным гледачам будуць цікавыя праграмы, якія робяцца пра іх у абласцях, — адзначыў генеральны прадзюсар Белтэлерадыёкампаніі Кірыл Казакоў на адкрыцці тэлеканала «Беларусь 4. Гомель». — Белтэлерадыёкампанія — гэта вялікі медыяхолдынг, у якога зараз шэсць каналаў. Рэгіянальны мы запускаем пад адзінай кнопкай «Беларусь 4», і, такім чынам, адразу дабаўляецца яшчэ пяць каналаў — па колькасці абласцей краіны.**

Гомельская тэлерадыёкампанія стала другой студыяй пасля Магілёва, дзе пачалося новае вяшчанне. У лічбавым пакеце можна настроіцца на частату 754МГц наземнага эфірнага вяшчання 56-га канала. Таксама «Беларусь 4. Гомель» будзе хутка даступны і ў сетках кабельных аператараў Гомельшчыны. З імі ўжо заключаны адпаведныя дамовы.

Платформа канала грунтуецца на ўніфікаванай сетцы вяшчання для ўсіх абласцей рэспублікі пад адзіным брэндам «Беларусь 4». І калі фільмы будуць ісці аднолькавыя, то навіны ў кожнай вобласці — свае.

— Менавіта да гэтага імкнуліся стваральнікі — быць у агульнасусветным трэндзе, развіваць тэлебачанне менавіта ў рэгіёнах, — падкрэслівае Кірыл Казакоў. — Паўсюль федэральныя ці нацыянальныя каналы сыходзяць у пэўныя тэматычныя нішы. Бо адны гледачы аддаюць перавагу праграмам пра спорт, другія — пра рыбалку, трэція — пра кулінарыю ці нешта яшчэ. А людзі, якія жывуць, напрыклад, у абласных цэнтрах ці глыбінцы, хочуць бачыць, ведаць яшчэ і пра тое, што адбываецца побач з імі, у іх горадзе. Дарэчы, і рэкламадаўца зараз ідзе ў рэгіёны. Яму цікава аўдыторыя канкрэтнай мясцовасці.



У гонар адкрыцця новага тэлеканала — паветраныя шары з лагатыпам «Беларусь 4. Гомель» (фота ТРК «Гомель»).

Дырэктар тэлерадыёкампаніі «Гомель» Святлана Яўрасава расказвае, што з пачатку вяшчання на «Беларусь 4» аб'ём інфармацыйных выпускаў павялічыўся адразу ў два разы:

— Гэты тэлеканал стварыўся па ініцыятыве Белтэлерадыёкампаніі і атрымаў падтрымку нашага губернатара Уладзіміра Дворніка. У перспектыве ён увойдзе ў агульнадаступны пакет. А пакуль мы будзем распаўсюджваць сігнал праз кабельных аператараў.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Ірына ДАЎГАЛА** лічыць, што адкрыццё канала «Беларусь 4» — сапраўдны падарунак для жыхароў паўднёвага рэгіёна:

— Сацыяльна значныя праграмы будуць адказам на пытанні людзей. У тым ліку цікавым уяўляецца праект з назвай «100 прычын, чаму я люблю Беларусь». У кожным раёне Гомельшчыны сапраўды можна знайсці шмат прычын, за што мы любім свой родны кут.

Магчымасці, якія адкрывае новы канал для калектыву тэлерадыёкампаніі «Гомель», дазволяць больш поўна і аб'ектыўна расказваць пра жыццё Гомельшчыны, яе дасягненні, гісторыю, культуру, пра выдатных людзей, якія жывуць на беларускім Палессі. Ужо зараз у распрацоўцы знаходзіцца каля 10 арыгінальных праектаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *astashkevich@zviazda.by*
**Фота аўтара.**

# «Беларусь 4. Віцебск»

**На Віцебшчыне пачаў вяшчанне тэлеканал «Беларусь 4. Віцебск». Аб'ём вяшчання канала — 20 гадзін у суткі.**

— На новым тэлеканале з 6 гадзін раніцы да 2 ночы гледачы змогуць убачыць мясцовыя навіны, а таксама трансляцыі найбольш цікавых і значных падзей вобласці. У прыватнасці, 9 кастрычніка ў вячэрнім эфіры плануецца трансляцыя тэлевізійнай версіі абласнога свята працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2015». Яно сёлета пройдзе ў старажытным Талачыне. Упэўнена, шмат ахвотных будзе паглядзець топавыя серыялы і іншае, — паведаміла «Звяздзе» дырэктар тэлерадыёкампаніі «Віцебск» Алена Панцюхова.

Гледачы могуць знайсці новы тэлеканал на частаце 754 Мгц (56-ы тэлевізійны канал) у Віцебску і Віцебскім раёне, а таксама ў сетках кабельных аператараў і інтэрактыўнага тэлебачання Zala.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*



# БЯСЕДА Ў «МАЖОРЫ» І «МІНОРЫ»

**Ансамбль народнай музыкі «Бяседа» вядомы ў першую чаргу тым, хто любіць і разумее каштоўнасць беларускай песні. Той, якая распавядае пра гісторыі мінулага, пра тое, чым жылі яшчэ нашы продкі. Кожная з іх кранае сэрцы, нараджаючы або спагаду і сум, або жаданне даць сабе волю ў весялосці. Чарговы раз у рамках акцыі тэлеканала «Беларусь 3» Белтэлерадыёкампаніі і грамадскага аб'яднання «Белая Русь», якая праводзіцца пры падтрымцы Выдавецкага дома «Звязда», адбыліся канцэрты калектыву ў Паставах і ў аграгарадку Юнькі.**



«За хвілінаю хвілінка ў бяседзе пралятаюць...»

«Любіць Беларусь» — менавіта пад такім дэвізам праходзіць гастрольны тур «Бяседы» па гарадах Беларусі. Стартаваўшы ў Гродне, ансамбль ужо выступіў у гарадах Гомельскай, Магілёўскай, Віцебскай абласцей. У пачатку кастрычніка артыстаў чакаюць у Брэсце і Століне, а завершыцца тур 10 кастрычніка ў Мінску. Канцэрты «Бяседы» ў Паставах і ў аграгарадку Юнькі сталі працягам акцыі на Віцебшчыне. У абодвух населеных пунктах нас сустрэла дажджлівае надвор'е, але гэта не перашкодзіла гледачам прыйсці і паслухаць знаёмыя песні ў выкананні любімага калектыву. У пастаўскім Доме культуры ў фае перад пачаткам канцэрта яблыку не было дзе ўпасці.

— Мяне сюды прывялі любоў да народнай музыкі і прафесійны інтарэс, — дзеліцца ўражаннямі **выкладчыца Варапаеўскай музычнай школы Святлана ШЫКАВЕЦ**. — У нас ёсць свой народны ансамбль, таму стараюся адсочваць, як працуюць розныя калектывы, каб нешта ўзяць сабе на заметку. І сам ансамбль «Бяседа» мы ведаем даўно, сочым за яго творчасцю ў інтэрнэце. Але кожны раз, калі выпадае магчымасць трапіць на канцэрт, — гэта сапраўднае свята для нас. У іх заўсёды яркія выступленні, прыгожыя касцюмы і, што вельмі важна, рэпертуар складаецца з беларускамоўных песень. Слухаеш нашу меладычную і прыгожую мову і думаеш: «Чаму ж самі так рэдка размаўляем па-беларуску?» Наогул, цікавасць да народнай музыкі ў мяне ад сям'і, бо мае цёткі, бабулі, маці — усе спяваць любілі. Раней жа без песні не абыходзіліся, а цяпер ужо рэдка пачуеш яе.

Публіка, трэба сказаць, была пераважна жаночай, і часцей сустракаліся тут людзі сталыя, але і моладзь прысутнічала. **Дырэктар Пастаўскага раённага дома культуры Ала ЧАРНЮК** гэта тлумачыць проста:

— Сюды прыйшлі найперш тыя, хто вырас на народнай песеннай культуры і не страціў любові да яе. «Бяседа» сабрала тую аўдыторыю, якую не часта ў нас сустрэнеш на іншых канцэртах, бо іх цікавяць у першую чаргу песня, якую яны чулі ад сваіх матуль ці самі спявалі ў маладосці. Ім хочацца ўзгадаць пра нешта, з настальгіі вярнуцца да сваіх вытокаў.

Хоць і хапае ў народных песнях твораў «у мінорах», не менш і такіх, ад якіх хочацца забыцца на ўсе клопаты і пайсці танцаваць. Ужо з першымі песнямі, падоранымі «Бяседай», узнікла такое жаданне... Спачатку прагучала кампазіцыя «Хлеб ды соль», а потым — такія знаёмыя мелодыі, як «А ў Марусі хата на пагосце», «Звончыкі», «Былі ў мяне сваты», «Вечарынка»... Варта адзначыць, што сёння ў калектыве працуе некалькі артыстаў, якія родам з Віцебшчыны: Ганна і Міхалай Алешкі, Сяргей Бяльцоў.

— Заўсёды з радасцю прыязджаеш кудысьці з канцэртам, але асабліва прыемна выступаць на роднай зямлі. Бо трапляеш туды, дзе прайшло дзяцінства, дзе былі маладымі твае бацькі... І калі ёсць узаемаразуменне, кантакт і радасць з боку гледачоў, то нас, артыстаў, эмоцыі таксама перапаўняюць, — кажа **ўдзельніца ансамбля Ганна АЛЕШКА**. — Народная музыка — гэта душа любога народа. І ў нашым калектыве на кожным канцэрце мы дзелімся ёю з людзьмі і, дзякуючы зваротнай рэакцыі публікі, нават стомленасці не адчуваем пасля выступленняў.

Працягваўся канцэрт, і не зніжаўся ўзровень эмоцый у глядзельнай зале: апладысменты, кветкі, крыкі «брава!». Са сцэны прагучала «Беларускае сала», «А ў садзе рэчанька» і многія іншыя кампазіцыі. Не абышлося і без прэм'ер — песню «Муза ты мая» прысвяцілі ўсім дзяўчатам-прыгажуням у зале. А вось падчас выканання кранальнай кампазіцыі «Бацькоў не забывай» (напісана мастацкім кіраўніком калектыву Леанідам Захлеўным) многія думкамі вярнуліся ў родныя мясціны...

*Ты са мною заўсёды, вясковая вуліца,*
*Дзе дзяцінства далёкага мары жывуць,*
*Дзе на ўзгорку бярозка высокая свеціцца*
*І над рэчкай дзявочыя песні плывуць...*

— Хочам, каб народ падхопліваў і працягваў спяваць нашы песні. Каб народнай песняй цікавілася падрастаючае пакаленне, — зазначае **саліст «Бяседы» Валянцін КІРЫЛЕНКА**. — Галоўнае — памятаць, што ўсё ў нашым жыцці трымаецца на любові. А народная песня — гэта сэрца народа. Праз яе можна перадаць усё тое, чым жывуць людзі.

...Аграгарадок Юнькі сустрэў у дзень канцэрта жыў сваім святам. Тут адзначалі Дажынкі. Ужо з раніцы тут ладзіліся розныя мерапрыемствы. Можна было і падсілкавацца чымсьці смачненькім, і паглядзець вырабы, прадстаўленыя супрацоўнікамі Пастаўскага дома рамёстваў. Днём прайшло спаборніцтва паміж маладымі сем'ямі, на якім, напрыклад, мясцовыя жыхары Пётр і Дар'я Шыбко занялі трэцяе месца. А пасля разам з трохгадовай дачкой Настассяй яны прыйшлі глядзець выступленне «Бяседы». Як і на папярэднім канцэрце, публіка прымала гасцей цёпла, дэманструючы сваю любоў (спявалі разам і нават падтанцоўвалі некаторыя). І зноў мелодыі гучалі адна за адной, яднаючы людзей, якія радаваліся свайму святу. Побач танцавалі маладыя дзяўчаты, дзеці... Паўтары гадзіны праляцелі вельмі хутка...

*Трэба прызнацца, трэба сказаць:*
*рады былі сюды завітаць,*
*І з пачуццём, разам спяём тое,*
*што хочам вам пажадаць:*
*Мы вам жадаем, каб да вашых хат*
*Сцежкі не ведаў ні ўрач, ні адвакат.*
*І каб было вам на ўсім вяку*
*Лёгка на сэрцы, цяжка ў кашальку...*



У Юньках можна было набыць сувенір на памяць.

Песня сціхае, артысты развітваюцца з гледачамі. Паступова сцэна і зала апусцелі, і я цікаўлюся ў **салісткі «Бяседы» Юліі САЎЧАНКІ**, што адчувае яна пасля такіх канцэртаў.

«Гледачы падтрымліваюць, не шкадуюць эмоцый, і гэта для нас стымул яшчэ больш працаваць і радаваць нашу публіку сваёй творчасцю», — адказала яна.

**P.S. Застаецца толькі нагадаць, што магчымасць трапіць на канцэрт ансамбля народнай музыкі яшчэ ёсць — 3, 4 і 10 кастрычніка «Бяседа» запрашае ўсіх прыхільнікаў на сустрэчу ў Брэсце, Століне і Мінску. А тыя, хто не трапіць на канцэрт, можа сачыць за падзеямі гастрольнага тура на сайце Белтэлерадыёкампаніі www.tvr.by.**

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*
**Фота аўтара.**

## Адкрытая студыя

# ПЫТАННІ І АДКАЗЫ

**Праграма «Адкрытая студыя» ў прамым эфіры на «Мінскай хвалі» (97,4 Мінск; 102,4 Мядзел; 104,8 Капыль; 105,3 Салігорск; 107,4 Маладзечна; 104,2 Барысаў; 105,5 Беразіно; 105,6 Старыя Дарогі; 102,6 Крупкі).**

Колькі сродкаў выдаткоўваецца ў цэнтральным рэгіёне на сацыяльную сферу? Якія новыя аб'екты з'явіліся ў апошні час на карце Мінскай вобласці? Як будуць вырашацца надзённыя праблемы людзей? На гэтыя і іншыя пытанні 6 кастрычніка ў 11.10 у праграме «Адкрытая студыя» адкажа намеснік старшыні Мінаблвыканкама Віктар Сірэнка. Задаць свае пытанні папярэдне можна на сайце mvradio.by ці па тэлефоне (8 017) 211 10 46. А таксама патэлефанаваць у прамы эфір па нумары (8 017) 211 10 47.




## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** Давядзецца адкласці свае пачуцці і эмоцыі ўбок. Калі жадаеце атрымаць вынік ад сваіх дзеянняў, то прымаць рашэнні варта на цвярозую галаву, а любыя крокі здзяйсняць у адпаведнасці з планам і тым, што вам падказвае розум. Пазіцыя павінна быць узважанай, тады можаце чакаць добрага выніку ад праведзенай працы. Будуць закладзены асновы для далейшага паляпшэння матэрыяльнага боку жыцця.

**СКАРПІЁН.** Тыдзень насычаны рознымі разумовымі працэсамі і кантактамі з іншымі людзьмі. Можаце трапіць у заблытаную сітуацыю, найхутчэй за ўсё, з прычыны ўласнай хітрасці. Спрабуючы падмануць усіх і выйграць для сябе ўдалае становішча, прасачыце за тым, каб самому не застацца ў дурнях. Зрэшты, падзеі будуць развівацца даволі хутка і спрыяльна для вас, таму калі і дапусціце дзесьці памылку, то яе, верагодна, нават ніхто не заўважыць, а вы зможаце рухацца далей па шляху свайго развіцця.

**СТРАЛЕЦ.** У пачатку тыдня праявіце ўсю сілу сваёй волі, настойлівасць і непрымірымасць. Гэты стан вельмі карысны для адстойвання сваёй пазіцыі, прасоўвання ідэй і наогул ва ўсіх справах, якія патрабуюць рашучасці і цвёрдасці. Таму ў пачатку тыдня можаце смела брацца за іх. Сярэдзіна тыдня прадказвае лёгкую перадышку. Ваша ўвага пераключыцца на сямейныя радасці. І бліжэй да канца тыдня з новымі сіламі вы зможаце зноў адправіцца ў шлях да сваёй мэты ці проста ўзяцца за выкананне пастаўленых перад сабой задач.

**КАЗЯРОГ.** У вашым жыцці будуць змены і вам трэба іх прыняць. Пачынаецца новы этап, прычым гэта зусім не значыць, што трэба будзе ад чагосьці адмовіцца, проста цяпер гэта паўстане для вас у новым выглядзе. Найхутчэй, перамены закрануць вашу пазіцыю ў грамадстве, у тых сферах, дзе вы маеце актыўныя стасункі з людзьмі, але ніяк не закране асабістае жыццё. Ваша задача заключаецца ў тым, каб прыняць іх, але пры гэтым не пускаць усё на самацёк.

**ВАДАЛЕЙ.** Вы схільны ўспрымаць усё ў змрочных тонах, таму варта адцягнуць увагу ад паўсядзённых клопатаў, каб не павялічваць працэнт негатыўнага настрою. Прысвяціце час якому-небудзь прыемнаму занятку (чытанню кнігі, медытацыі), гэта дазволіць вярнуцца ў звыклае рэчышча жыцця і аднавіць свой эмацыйны фон. У хуткім часе ўсё наладзіцца і наступіць світанак. Новы дзень — новыя ўражанні. Надайце ўвагу свайму ўнутранаму свету. У гэты перыяд абвострыцца ваша інтуіцыя і здольнасці да вывучэння, самапазнання.

**РЫБЫ.** Тыдзень новых пачынанняў. У вас будуць з'яўляцца самыя розныя ідэі і жаданні ва ўсіх сферах жыцця. Можна сказаць, што гэты час для вас удалы, але вельмі дынамічны. Зрэшты, калі будзе дастаткова сіл, то зможаце паспець усюды і атрымаць патрох ад кожнага мерапрыемства, што ў значнай меры падыме настрой. Асноўныя напрамкі, якія будуць задзейнічаны на гэтым тыдні, — гэта рамантычныя адносіны і новыя бізнес-ідэі. А фартуна змяшае ўсё гэта самым незвычайным чынам.

## ЧАЦВЕР, 8 КАСТРЫЧНІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.45** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.10** Зона Х.
**9.10, 22.40** **Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00** **Серыял «Айцец Мацвей».**
**12.10, 16.35** **Серыял «Сямейныя меладрамы-5» .**
**13.10** Дзень у вялікім горадзе.
**14.05** **Серыял «Думай як жанчына».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 1.15** **Серыял «Вікторыя».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.25** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** «Мы — беларусы!»
**1.05** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 16.10** Стайл-шоу «Арол і Рэшка. На краі свету».
**10.05, 21.10** Дак. цыкл «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**11.05** «Зразумець і абясшкодзіць».
**11.40** Вось гэта дзіва!
**12.20, 17.55** **Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**13.20, 22.10** **Серыял «Косці».**
**14.15, 19.05** **Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**17.00, 23.05** «Пін_код».
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.55** **Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50, 13.55, 18.00, 1.20** «Калейдаскоп».
**8.00, 18.10, 21.30** **«Архіў смерці». Серыял.**
**11.55** **«Зусім прапашчы». Камедыя.**
**13.30, 0.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Таццяны Аляксеевай.
**14.10** **«Сабор Парыжскай Божай маці». Драма.**



**16.05** «Сіла веры».
**16.30** **«Набярэжная тумана». Драма.**
**20.10, 0.25** «Дыя@блог». «Правечнае».
**20.40** «Калыханка».
**21.00** Вандроўка з «Бяседай». Магілёўская вобласць.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.30, 14.30, 23.35** Тэніс. Турнір ВТА. Пекін.
**13.30** Козел пра футбол.
**13.55** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**16.30** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. БГК ім. Мяшкова (Беларусь) — «Лаграньё» (Іспанія).
**18.00** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. УНІКС (Казань) — «Цмокі-Мінск».
**19.05, 23.25** PRO спорт. Навіны.
**19.10** Авертайм. КХЛ.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Поўначсталь» (Чарапавец).
**21.50** Більярдны спорт. Камандны чэмпіянат свету. Мужчыны. 1/2 фіналу. Беларусь — Кіргізія.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!»
**18.20** **Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30** Дак. серыял «Рэвалюцыі XXI стагоддзя». «Украіна. Перайсці праз Майдан».
**22.30** «Нюхач». Новы сезон.
**0.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 20.15** «Дакументальны праект»: «Я крочу па краіне».
**9.30, 21.20** «Участак лейтэнанта Качуры». «Сеткавая пагроза».
**10.40** **Серыял «Салдаты 10».**
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.50** «Ежа багоў».
**14.45, 23.40** **Серыял «Энігма».**
**16.50** «Культурная сталіца». Брэст.
**17.35** «Званая вячэра».
**18.35** «Дакументальны праект»: «Страчаны дар продкаў».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Простыя пытанні».
**23.20** «Аўтапанарама».
**1.20** «Таямніцы свету».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Другі дом».
**9.30, 23.00** **Маст. фільм «Нядзельны тата».**
**11.10** **Маст. фільм «Суседзі па разводзе».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20** Дак. серыял «Давайце разбярэмся!»
**14.15** **Серыял «Адна сям'я».**
**16.20, 5.20** Дак. серыял «Іншы свет».
**16.50** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**17.20, 3.35** **Серыял «Маўклівы сведка».**
**19.25** **Серыял «Скліфасоўскі».**
**22.05** Ток-шоу «Слова за словам».
**0.30** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
**0.40** **Маст. фільм «Гэта мой сабака».**
**2.45** Дак. серыял «Прыгажосць патрабуе!»

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.05** **Серыял «Праўда хавае хлусню».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30** **Серыял «Тайны следства».**



**19.10, 20.55** **Серыял «Скліфасоўскі».**
**22.00, 23.10** **Серыял «Ідэальная ахвяра».**
**23.50** «Паядынак».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Паедзем, паядзім!»
**7.10** **Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**8.05** «Лаліта».
**9.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**10.20** **Серыял «Ляснік».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.40** «Справа густу».
**15.05, 16.20** **Серыял «Ліцейны».**
**17.55** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.40** **Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**21.25** **Серыял «Мянтоўскія войны».**
**23.05** «Анатомія дня».
**23.45** **Серыял «Знакі лёсу-3».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.40, 21.00, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.50, 19.45** **Серыял «Злачынная імперыя».**
**8.45, 18.40** **Серыял «Чэрап і косці».**
**9.30** «Кінаблакнот».
**9.40** Дак. серыял «Тайны прыроды».
**10.15** «Хобі TV».
**10.45** **Баявік «Васьміножка».**
**12.55, 13.50, 15.45, 16.40, 18.30, 19.25, 20.55** «Хатняя крама».
**13.05** **Серыял «Флэш».**
**14.10** **Серыял «Лавізна».**
**16.30** «Золата маўчання».
**17.00** **Серыял «Радзіма».**
**19.30** «Фэшн is my прафэшн».
**20.45** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік».
**21.15** **Драма «Помста».**
**23.20** **Серыял «Даведнік па сямейным жыцці».**

### ВТБ

**6.00** «PLAY”.
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30, 14.30, 4.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**8.00, 17.30, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 18.00, 23.30** Серыял «Анжаліка».
**10.00, 19.00** Серыял «Месяц».
**11.00** Меладрама «Каханне з рызыкай для жыцця».
**12.50** «Ералаш».
**13.30, 20.00** Серыял «Кухня 4».
**15.00, 3.00** «Ты нам падыходзіш».
**16.00, 1.00** Серыял «Навіны».
**17.00, 4.30** «Лаві момант».
**21.10** Прыгоды «Авантурысты».
**23.10, 2.30, 5.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30, 5.30** «Дурні і дарогі».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 22.05** «Сага пра Фарсайтаў». Серыял.
**12.10, 20.45** «Правілы жыцця».
**12.40** «Пісьмы з правінцыі». Уфа (Башкартастан).
**13.05** «Пасляслоўе». Маст. фільм.
**14.40, 1.40** «Сусветныя скарбы культуры».
**15.10** «Засадны полк». «Барыс Карнілаў».
**15.35** «Жывыя карцінкі. Тамара Палетыка». Дак. фільм.
**16.15** «Абсалютны слых».
**16.55** «Легенды і былі дзядзькі Гіляя». Дак. фільм.
**17.40** IX Міжнародны конкурс арганістаў імя Мікаэла Тарывердзіева.
**18.40** «Джота ды Бандоне». Дак. фільм.
**18.45** Жыццё выдатных ідэй. «Асірыянавы скандал».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**21.15** «Культурная рэвалюцыя».
**23.00** Да 90-годдзя рэжысёра. «Хуцыеў». Дак. серыял.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** «90 гадоў з дня нараджэння Андрэя Сіняўскага. «Абрам ды Мар'я». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Алена Камбурава. 2008 год.
**6.55, 9.40, 11.00, 13.00, 14.25, 15.40, 17.00, 18.45, 20.25, 21.40, 23.00, 0.50, 2.20, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.15** Маст. фільм «Блакітныя маланкі».
**8.45** М/ф «На лясной эстрадзе».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Нараджаныя ў СССР».
**12.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. Валерый Ярушын. 2008 год.
**13.20** Маст. фільм «Мужчыны ёсць мужчыны».
**14.45** М/ф «Была ў слана мара».
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Юрый Лобікаў, Раіса Нур. 2007 год.
**19.10** Маст. фільм «Марына».
**20.40** М/ф «Чараўнік ОХ».
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Віктар Цой». 2005 год.
**1.20** Маст. фільм «Вы Пецьку не бачылі?».
**2.45** М/ф «Ліса-будаўнік».

### EUROSPORT

**4.00** Бокс. Брэмер (Германія) — Конрад (Германія).
**6.00, 1.30** Watts!
**7.00** «Яго вялікасць футбол».
**7.30, 14.00** Веласпорт. Тур Ламбардыі.
**8.30, 13.15** Веласпорт. Тур Дэ Еўраметраполь.
**9.25** Спартыўныя прыгоды.
**9.30, 10.45, 16.00, 17.15, 21.00, 22.15** Супербайк. Чэмпіянат свету.
**10.15, 16.45, 21.45** Суперспорт. Чэмпіянат свету.
**11.30, 19.30, 2.30** Футбол. Чэмпіянат MLS
**15.00, 23.00** Веласпорт. Abu Dhabi Tour.
**18.00, 19.25** Футбол. Сусветныя галы.
**18.30** Футбол. MLS. Лепшыя моманты.
**19.00** Футбол. Лаціна.
**0.00** Байцоўскі клуб. Кубак Татнафта.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.40, 22.00, 3.35** Серыял «Былыя».
**6.45** Камедыя «Каханне і іншыя катастрофы».
**8.25** Камедыя «Гамбіт».
**10.45** Камедыя «Ад 180 і вышэй».
**12.30** Камедыя «Аб чым маўчаць дзяўчаты».
**14.00, 14.45, 15.25** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.10, 20.00, 22.50, 0.55, 2.55, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Маё вялікае грэчаскае лета».
**18.25** Камедыя «Вяселле па абмене».
**20.20** Камедыя «Як жаніцца і застацца халастым».
**23.10** Камедыя «Выкрутасы».
**1.15** Камедыя «Шосты элемент».
**3.10** Серыял «Пакетная здзелка».
**4.00** Камедыя «Два светы».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.10** «Доктар І...»
**8.35, 19.00, 1.25** Серыял «Курт Сеіт і Аляксандра».
**9.55, 3.40** Дак. серыял «Судовыя страсці».
**10.45, 4.25** Дак. серыял «Па справах непаўнагадовых».
**11.40** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.35** Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
**13.30, 17.55** Серыял «Тайны следства».
**14.30** «Простыя складанасці».
**15.00, 2.55** «Нераскрытыя тайны».
**16.00** «Шчырая размова».
**16.55, 21.50** Серыял «Мар'ін гай».
**20.50, 0.40** Серыял «Дарога на востраў Пасхі».
**22.50** «Зорныя гісторыі».
**23.45** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
**0.30** «Prokіно».

### ТБ1000

**5.40, 2.10** Жахі «Воўк».
**7.50** Драма «Эпоха нявіннасці».
**10.05** Камедыя «На жыўца».
**12.05** Драма «Адчыненае акно».
**13.40** Камедыя «Настрой індыга».
**15.50** Баявік «Быць Флінам».
**17.30** Фантастыка «Галодныя гульні: І ўспыхне полымя».
**20.00** Трылер «Палонніцы».
**22.40** Меладрама «Крок наперад: Усё або нічога».
**0.40** Драма «Вельмі добрыя дзяўчаткі».
**4.30** Драма «10 крокаў да поспеху».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Злачынства і пакаранне».
**8.20** Трагікамедыя «Яно».
**10.30** Трагікамедыя «Вар'яцкая дапамога».
**12.35** Камедыя «Саламяны капялюшык».
**15.05** Меладрама «8 першых спатканняў».
**16.40** Драма «Weekend».
**18.20** Драма «Географ глобус прапіў».
**20.20** Драма «Клас карэкцыі».
**22.00** Дэтэктыў «Гатэль».
**23.30** Камедыя «Хлопец з Марса».
**1.15** Камедыя «Дэжа вю».
**3.15** Камедыя «Пісталет Страдывары».
**4.45** Драма «Алеся».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Сканеры старажытнага свету.
**6.50, 8.10** Гульні розуму.
**7.20, 13.10** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40, 12.40** Зрабі або памры.
**9.20, 13.30, 19.20** Шаша праз пекла.
**10.10, 14.20, 20.10** Ледзяная дарога.
**11.00** Машыны: разабраць і прадаць.
**11.50** Золата Юкана.
**15.10** Тайны гарыл.
**16.00** Дзікія жывёлы Поўначы.
**16.50, 21.10, 1.10, 4.30** Золата ў халоднай вадзе.
**17.40, 21.50, 2.00, 5.15** Дзікі тунец.
**18.30** Супербудаванні Трэцяга рэйха.
**22.40, 2.50** 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас.
**23.30, 3.40** Расследаванні авіякатастроф.
**0.20** Эвакуацыя Зямлі.

### DISCOVERY

**8.00, 12.30** Мяцежны гараж.
**8.50** Навука магіі.
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Багажныя войны.
**11.35, 1.00, 7.13** Голыя і напалоханыя.
**13.25, 6.25** Эфект Карбанара.
**15.15, 5.38** Поўны фарсаж.
**16.10, 3.00** Махінатары на трасе.
**18.00** Іржавая імперыя.
**19.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**20.00** Склады.
**22.00** Буйны ўлоў.
**23.00** Смяротны ўлоў.
**0.00** Дарожныя каўбоі.
**2.00, 4.50** Стальныя хлопцы.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

## На экране

# ВЫЖЫВУЦЬ ТОЛЬКІ ПАЛЮБОЎНІКІ

**Істэрыя па сюжэтах з вампірамі пачалася пасля паспяховай экранізацыі кніг Стэфані Маер, першая з якіх, як і фільм, называлася «Змяркание». Выканальнікі не толькі галоўных роляў, але і эпізадычных, аказаліся ў цэнтры ажыятажу з прычыны раптоўнай любові да абсалютна іншага вобраза істоты. Вампіры ўжо не героі фільмаў жахаў і нават не інтэлігентна крыважэрныя, як, напрыклад, у фільме «Інтэрв'ю з вампірам» Ніла Джордана. Яны выключна гуманныя, бясконца адукаваныя і, вядома ж, прыгожыя.**



Фільм «Выжывуць толькі палюбоўнікі» Джыма Джармуша («Зламаныя кветкі», «Больш дзіўна, чым у раі», «Мярцвяк», «Кава і цыгарэты») выйшаў у 2013 годзе і ідэальна ўпісаўся ў кан'юнктуру. Праўда, рэжысёр рыхтаваў праект сем гадоў, таму некаторае павярхоўнае супадзенне вобразаў персанажаў абсалютна выпадковае. Героямі карціны сталі вампіры Адам і Ева, кожнаму з якіх некалькі сотняў гадоў.

Яны не забіваюць і не ядуць людзей, добра ўпраўляюць сваім апетытам і маюць наладжаную сістэму харчавання, што ахвяраў не прадугледжвае. Адам у дэпрэсіі. Ева прыемна разважлівая. Яны любяць адно аднаго. Ева, якую сыграла Цільда Суінтан, — фанат літаратуры (калі яна рыхтуецца да пералёту, бярэ з сабою кнігі). Адам (Том Хідлстан) аказваецца таленавітым музыкантам.

Рэтраспекцыя на мінулае спрацоўвае на карысць як вобразам герояў, так і фільму. Татара-мангольскае іга, інквізіцыя, паэты часоў Шэкспіра, пакаленне бітнікаў — гэта стагоддзі развіцця чалавека, якія навісаюць над намі ўсведамленнем цяжару мінулага, якому мы таксама нічым не абавязаны (узяць ад яго найлепшае і не паўтарыць найгоршае). Спакойнае наладжанае жыццё палюбоўнікаў парушаюць дэпрэсія Адама, нечаканае з'яўленне Авы, сястры Евы, і ўлюбёная для Джармуша тэма смерці.

Цільда Суінтан, якая запомнілася ролямі халодных, бяздушных, абыякавых жанчын («Пасля прачытання спаліць» братоў Коэн ці «Каралеўства поўнага месяца» Уэса Андэрсана), у «Палюбоўніках» выступіла якраз у «цёплым» вобразе, нягледзячы на сутнасць сваёй гераіні. Яшчэ адна актрыса — Мія Васікоўска, што выканала ролю Авы, — наадварот, сыграла ў сваім найлепшым амплуа: бязглуздай і крыху ненармальнай дзяўчыны.

Рэжысёр Джым Джармуш — адзін з галоўных (пры гэтым паспяховых) прадстаўнікоў незалежнага амерыканскага кіно. Ён, зразумела, супрацоўнічае з буйнымі прадстаўнікамі кінабізнеса, але можа сабе дазволіць пазбягаць чужога ўплыву на сваю творчасць. Джармуш — пастаянны госць і ўдзельнік Канскага кінафестывалю, і фільмы яго можна па няведанні аднесці да еўрапейскага кіно.

Прэм'ера фільма «Выжывуць толькі палюбоўнікі» прайшла на Канскім кінафестывалі 2013 года, дзе карціна ўдзельнічала ў асноўным конкурсе і прэтэндавала на Залатую пальмавую галіну.

«Выжывуць толькі палюбоўнікі» пакажа тэлеканал «TV1000».

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

## ПЯТНІЦА, 9 КАСТРЫЧНІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.45** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10, 22.15 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Серыял «Айцец Мацвей».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-5» .**
**13.10** Дзень у вялікім горадзе.
**14.05 Серыял «Думай як жанчына».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Вікторыя».**
**17.45** Спецыяльны рэпартаж.
**18.00** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**21.00** Панарама.
**21.45** «Мы — беларусы!».
**22.40, 1.20 Серыял «Сваты-3». 1—3-я серыі.**
**1.05** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00** Тэлебарометр.
**9.05, 15.45** Стайл-шоу «Арол і Рэшка. На краі свету».
**9.55** Дак. цыкл «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**10.50** «Зразумець і абясшкодзіць».
**11.25** Капейка ў капейку.
**12.00, 17.40 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**12.55 Серыял «Косці».**
**13.50 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**16.50, 0.20** «Пін_код».
**18.40** Выбар гледачоў. Баявік «Новы Чалавек-павук».
**21.00** Цела чалавека.
**21.30** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.45** Футбол. Еўра-2016. Кваліфікацыя. Славакія — Беларусь.
**23.45** Футбол. Еўра-2016. Агляд гульнявога дня.
**1.05** Рэпарцёр.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50, 17.55, 2.00** «Калейдаскоп».
**8.05 «Архіў смерці». Серыял. Заключная серыя.**
**13.00** «Салдаты памяці». Дак. фільм.
**13.30 «Сабор Парыжскай Божай маці». Драма.**
**15.25** «Сіла веры».
**15.55** «Вялікая музыка для Вялікай Брытаніі». Дак. фільм.
**16.20 «Зусім прапашчы». Камедыя.**
**18.10** «Эпоха ВІА». Дак. фільм.
**19.05, 0.25 «Бітлз». «Дапамажыце!». Камедыя.**
**20.40** «Калыханка».
**21.00** Вандроўка з «Бяседай». Віцебская вобласць.
**21.25 «Абеліск». Драма.**
**23.00** У. Ткачэнка. «Сімфонія «Бітлз». Выконвае Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга.
**0.00** «Камертон». Народны артыст Беларусі Міхаіл Фінберг.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.30, 15.55, 22.05** Тэніс. Турнір ВТА. Пекін. 1/4 фіналу.
**13.30** Фактар сілы.
**13.55** Футбол. Еўра-2017. U-21. Кваліфікацыя. Беларусь — Турцыя.
**17.25** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Славенія — Беларусь.
**19.25, 0.10** PRO спорт. Навіны.
**19.30** Піт-стоп.
**20.00** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**20.30** Більярдны спорт. Камандны чэмпіянат свету. Мужчыны. Фінал. Украіна — Беларусь.
**0.20** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.05** «Вучыцца жыць».
**14.35** «Час пакажа».
**16.20 Маст. фільм «Ты — мне, я — табе».**
**18.20** «Чакай мяне. Беларусь».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Канцэрт «Мы разам. Мінск».
**23.50** «Што? Дзе? Калі? У Беларусі».
**1.00** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 20.15** «Дакументальны праект»: «Я крочу па краіне».
**9.30, 21.20** «Участак лейтэнанта Качуры». «Сеткавая пагроза».
**10.40 Серыял «Салдаты 10».**
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Ежа багоў».
**14.45 Серыял «Энігма».**
**16.50** «Добры дзень, доктар!»
**17.35** «Званая вячэра».
**18.35** «Дакументальны праект»: «Калі Зямля злуецца».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Такі лёс».
**23.50** «Вялікая гульня». Покер-дуэль.
**0.35 Маст. фільм «Забойныя канікулы».**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Любімыя акцёры».
**9.30, 0.55 Маст. фільм «Яна вас кахае».**
**11.05 Маст. фільм «Гэта мой сабака».**



**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 2.30** Дак. серыял «Давайце разбяромся!».
**14.15 Серыял «Адна сям'я».**
**16.20** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20, 3.20 Серыял «Маўклівы сведка».**
**19.25 Серыял «Пацалунак лёсу».**
**22.50 Маст. фільм «Чорны цюльпан».**
**5.00** Дак. серыял «Прыгажосць патрабуе!».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.05 Серыял «Праўда хавае хлусню».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Тайны следства».**
**19.10, 21.30 Серыял «Скліфасоўскі».**
**22.35, 23.10 Маст. фільм «Танга матылька».**
**0.30** «Новая хваля-2015». Трансляцыя з Сочы.

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Следства вялі...».
**7.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**8.05** «Лаліта».
**9.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**10.20 Серыял «Ляснік».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.40** «Справа густу».
**15.05, 16.25 Серыял «Ліцэй-ны».**
**17.55** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.40 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**23.05 Серыял «Знакі лёсу-3».**
**0.45** Ток-шоу «Большасць».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.40, 21.00, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад .
**7.50, 19.45 Серыял «Злачынная імперыя».**
**8.45, 18.45 Серыял «Чэрап і косці».**
**9.30, 10.45, 13.50, 15.45, 18.40, 19.30, 20.55** «Хатняя крама».
**9.45** Дак. серыял «Тайны прыроды».
**10.30** «Кінаблакнот».
**11.00 Меладрама «Мачаха».**
**13.05 Серыял «Флэш».**
**14.10 Серыял «Лавізна».**
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.00 Серыял «Радзіма».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Сярод белага дня».**
**22.45** «Хобі + TV». «Свой фермер».

### ВТБ

**6.00** «PLAY».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30, 14.30, 4.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**8.00, 17.30, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 13.00** «Ералаш».
**9.00** Серыял «Анжаліка».
**10.00, 19.00** Серыял «Месяц».
**11.00** Прыгоды «Авантурысты».
**13.30, 20.00** Серыял «Кухня 4».
**15.00, 3.00** «Ты нам падыходзіш».
**16.00** Серыял «Навіны».
**17.00, 4.30** «Лаві момант».
**18.00, 23.30** «Уральскія пельмені».
**21.10** Баявік «Ягуар».
**23.15, 1.00, 5.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30** Скетчком «Студэнты».
**1.30, 5.30** «Дурні і дарогі».
**2.00** «Ленінградскі stand-up клуб».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.20** Шэдэўры старога кіно. «Слаўны хлапчына». Маст. фільм.
**11.45** «Людміла Фяцісава. Запомніце мяне вясёлай...» Дак. фільм.
**12.10** «Правілы жыцця».
**12.40** «Пісьмы з правінцыі». Дзяцігарск (Свярдлоўская вобласць).
**13.05** «Канстанцін Цыялкоўскі». Дак. фільм.
**13.15** «Абрам ды Мар'я». Дак. фільм.
**15.10** «Засадны полк». «Дзмітрый Кедрын».
**15.35** «Кароткая сустрэча». Маст. фільм.
**17.05** Білет у Вялікі.
**17.45** IX Міжнародны конкурс арганістаў імя Мікаэла Тарывердзіева.
**18.45** «75 гадоў з дня нараджэння акцёра. «Валерый Носік». Дак. фільм.
**19.45** Смеханастальгія.
**20.15** «Доўгі дзень». Маст. фільм.
